**ЭКАЛОГІЯ**

**Забруджваем воду – забруджваем сваю будучыню**

***Па віне ААТ «Бялынічы» на тэрыторыі комплексу па адкорме буйной рагатай жывёлы ў Галоўчыне былі парушаныя ўмовы скіду сцёкавых вод.***

У выніку перапаўнення рэзервуараў для захоўвання арганікі на прылеглую тэрыторыю комплексу і ў водаахоўную зону ракі Вабіч былі скінуты сцёкавыя воды і гной.

Раённая інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ўжо раней прыцягвала ААТ «Бялынічы» да адміністрацыйнай адказнасці па ч. 2 арт 15.53 КаАП. І зноў юрыдычнай асобай парушаныя патрабаванні п. 7 арт 47 Воднага кодэкса Беларусі. За гэта правапарушэнне прадугледжана адміністрацыйная адказнасць па ч. 2 арт 15.53 КаАП, штраф – 36 бв.

**Аліна ЦЫГАНІЙ.**

**Фота аўтара.**


**фото: загрязнение**

***На прылеглай тэрыторыі комплексу і ў р. Вабіч вада забруджана сцёкавымі водамі з гноем.***